УДК 94(438)(=161.3)«19»

# БЕЛОРУСЫ В ПОЛЬШЕ В ПЕРИОД РАСПАДА ТРАДИЦИОННОГО ОБЩЕСТВА

***Э. МИРОНОВИЧ***[1)]

[1)]*Институт истории и политических наук Белостокского университета, пл. Независимого объединения студентов, 1, 15-420, г. Белосток, Польша*

Анализируется влияние изменений в общественно-политическом и социально-экономическом устройстве Польши после Второй мировой войны на жизнь белорусов в Белостокском воеводстве. Описаны изменения в повседневной жизни и быту, выявлено воздействие аграрной реформы на социальную структуру и экономическое положение белорусов. Отмечается, что новый строй в послевоенной Польше открыл для белорусов возможности для социального, культурного и политического роста, а потому не воспринимался ими как трагедия.

***Ключевые слова:*** Польша; белорусы; общество; трансформация; аграрная реформа; повседневность.

# БЕЛАРУСЫ Ў ПОЛЬШЧЫ Ў ПЕРЫЯД РАСПАДУ ТРАДЫЦЫЙНАЙ ГРАМАДСКАСЦІ

***Э. МІРАНОВІЧ***[1*]

[1*]*Інстытут гісторыі і палітычных навук Беластоцкага ўніверсітэта, пл. Незалежнага згуртавання студэнтаў, 1, 15-420, г. Беласток, Польшча*

Аналізуецца ўплыў перамен у грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным уладкаванні Польшчы пасля Другой сусветнай вайны на жыццё беларусаў на Беласточчыне. Апісаны змены ў паўсядзённым жыцці і быце, вызна-

**Образец цитирования:**
Міранові Э. Беларусы ў Польшчы ў перыяд распаду традыцыйнай грамадскасці // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. 2018. № 2. С. 75–81.

**For citation:**
Mironowicz E. Belarusians in Poland in the period of destruction of the traditional society. *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2018. No. 2. P. 75–81 (in Belarus.).

**Автор:**
***Эугениуш Миронович*** – доктор исторических наук, профессор; заведующий кафедрой международной политики.

**Author:**
***Eugeniusz Mironowicz***, doctor of science (history), full professor; head of the department of international politics.
*ebma@interia.pl*

чана ўздзеянне аграрнай рэформы на сацыяльную структуру і эканамічнае становішча беларусаў. Адзначаецца, што новы лад у пасляваеннай Польшчы адкрыў для беларусаў магчымасці для сацыяльнага, культурнага і палітычнага росту, а таму не ўспрымаўся як трагедыя.

***Ключавы словы:*** Польшча; беларусы; грамадства; трансфармацыя; аграрная рэформа; паўсядзённасць.

# BELARUSIANS IN POLAND IN THE PERIOD OF DESTRUCTION OF THE TRADITIONAL SOCIETY

***E. MIRONOWICZ***[a]

[a]*Institute of History and Political Science, University of Bialystok,*
*1 Niezależnego Zrzeszenia Studentów Avenue, Białystok 15-420, Poland*

The article is devoted to the analyze of thee changes in the political and socio-economic life of Poland after the World War II and their influence on the life of Belarusians who resided in Bialystok region. The author describes the changes in their everyday life and the housekeeping, reveals the influence of agrarian reform on the social structure and economic situation of Belarusians. It is noted that in the post-war Poland Belarusians got the opportunities for social, cultural and political development, and therefore they do not perceived the changes as a tragedy.

***Key words:*** Poland; Belarusians; society; transformation; agrarian reform; everyday life.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ў новых межах польскай дзяржавы ва ўсходняй частцы Беластоцкага ваяводства па-ранейшаму заставаліся каля 150 тыс. беларусаў [1, s. 103–110]. У дадзенай працы за асноўны крытэрый вылучэння беларусаў, услед за адміністрацыйнай практыкай, прымаецца прыналежнасць да праваслаўнага веравызнання. Па-за разглядам застаецца даволі шматлікае каталіцкае беларускамоўнае насельніцтва, якое пераважна адносіла сябе да палякаў.

Значная частка беларускага насельніцтва пражывала ў вёсках, дзе на працягу дзесяцігоддзяў заставаліся нязменнымі рытм жыцця сялян, выгляд і спосаб вядзення гаспадаркі, звычаі. З другога боку, адразу пасля вайны пачаўся працэс міграцыі маладога пакалення ў гарады, дзе былі праца, магчымасць зарабіць уласныя грошы, свабодны час і больш прывабны лад штодзённага жыцця. Перасяленцы з вёсак, прыстасоўваючыся да новага грамадскага асяроддзя, вымушаны былі пакідаць свае традыцыі, мову, звычаі. Аднак вёска яшчэ некалькі гадоў жыла ў сваім нязменным рытме.

На падставе шматлікіх вусных аповедаў і існуючых у выглядзе музейных экспанатаў помнікаў матэрыяльнай культуры ўсходняй Беласточчыны можна ўзнавіць вобраз тыповай сялянскай гаспадаркі. Гаспадарчы двор звычайна складаўся з трох галоўных будынкаў – хаты, гумна і хлява. На землях, населеных беларусамі, забудова была пераважна драўляная, крытая саломай. Жылыя хаты, крытыя гонтай, сустракаліся рэдка, звычайна будаваліся ў мясцінах, размешчаных па суседству з лесам, і часцей за ўсё належалі ўладальнікам лясных дзялянак. Таксама рэдка сустракаліся хаты, пакрытыя чырвонай керамічнай дахоўкай. Не кожная сялянская гаспадарка мела ўласную студню, паколькі яе пабудова патрабавала пэўных сродкаў на закупку бетонных кругоў, таму бяднейшыя гаспадары бралі ваду ў багацейшых суседзяў.

Звонку жылыя хаты на тэрыторыі ўсходняй Беласточчыны адрозніваліся арыгінальнасцю дэкаратыўных элементаў. Традыцыя ўпрыгожвання новых драўляных сялянскіх хат захоўвалася яшчэ доўга пасля Другой сусветнай вайны і мела масавы характар. Толькі змена будаўнічага матэрыялу на цэглу ў 1960-х гг. прывяла да заняпаду гэтай формы народнай творчасці. Упрыгожванне жылых будынкаў вынікала не столькі з магчымасці лёгка апрацоўваць будаўнічы матэрыял, колькі з попыту вясковай супольнасці на гэты від мастацкай творчасці. Выгляд будынку служыў таксама своеасаблівай рэкламай умеласці майстра, які ўзводзіў хату[1]. Упрыгожваліся перш за ўсё верхняя частка, вуглы, вокны і ганкі. Былі таксама багата ўпрыгожаныя рознымі арнаментамі аканіцы, якія рэдка служылі для замыкання вокнаў, а з'яўляліся перш за ўсё дэкаратыўным элементам.

Усярэдзіне сялянская хата падзялялася на кухню, пакой-спальню і гаспадарча-складскую частку. Значную плошчу на кухні займала печ, на якой знаходзіліся спальныя месцы. Кухонную мэблю складалі лаўкі, пастаўленыя каля сцен, стол, павешаныя на сцены ці пастаўленыя паліцы для посуду. Лаўкі таксама выкарыстоўваліся як спальныя месцы. Пасцель у пакой прыносілі толькі ўвечары, а раніцай яе забіралі ў гаспадарча-складскую част-

[1]*Юзвюк У.* Знешняе ўпрыгожванне хат // Беларускі каляндар на 1969 год. Беласток : Беларус. грамад.-культур. тав-ва, 1968. С. 217.

ку. Гэта было абумоўлена тым, што сем'і складаліся з розных пакаленняў, часам разам жылі дзесяць і больш чалавек, таму ўсім не хапала месца на печы і ў галоўным пакоі, дзе стаялі два-тры драўляныя ложкі.

У асенне-зімовы перыяд пакой і кухня былі запоўнены прыладамі для апрацоўкі лёну і воўны. Калаўроты прыносілі з гарышча адразу ж пасля заканчэння палявых прац, а кросны – часцей за ўсё пасля свята Богаяўлення. Падлога ў хатах была пераважна драўляная, хаця часам сустракалася і гліняная.

Большасць прадметаў, якія ўжываліся ў гаспадарцы і знаходзіліся ў хатах, выраблялiся самімі гаспадарамі ці вясковымі рамеснікамі – сталярамі, кавалямі, ганчарамі, краўцамі і г. д. Выкарыстоўваўся пераважна гліняны кухонны посуд – міскі, збанкі, ва́зы. Некаторыя прадметы, асабліва больш умяшчальныя, служылі для захоўвання прадуктаў на працяглы тэрмін. Найважнейшай сыравінай для вытворчасці неабходных у гаспадарцы рэчаў было дрэва. У яго апрацоўцы беларусы дасягнулі вялікага майстэрства. З гэтага матэрыялу выраблялiся сярод іншага ўсе прылады, неабходныя для ткацтва – пралкі, церніцы, калаўроты, кросны, а таксама амаль усе элементы сродкаў транспарту – вазоў, саняў. Акрамя таго, драўлянымі былі прылады асноўнага гаспадарчага значэння – цапы, граблі, вілы для сена, бочкі, дзежкі, карцы, мётлы, лапаты і шмат іншага[2]. Без ужывання металічных элементаў узводзілася і большасць будынкаў.

Другой важнай сыравінай у гаспадарцы была салома. З яе выраблялі перш за ўсё посуд і ёмістасці самага рознага прызначэння. У найбуйнейшых з іх можна было змясціць каля 2 ц збожжа, а найменшыя па велічыні можна параўнаць з міскай. Ёмістасці з саломы часцей за ўсё служылі для захоўвання прадуктаў, паколькі у адрозненне ад гліняных вырабаў, яны лёгкія і не б'юцца[3].

Салома як матэрыял для пакрыцця даху мела выдатныя тэрмастатычныя ўласцівасці: ахоўвала зімой ад холаду, а летам не дапускала празмернага перагрэву страхі, таму стрэхі былі зручным месцам для захоўвання прадуктаў, асабліва садавіны.

Паўсюднае выкарыстанне драўніны і саломы для вырабу гаспадарчых прадметаў і прылад тлумачылася даступнасцю гэтых матэрыялаў, а таксама сведчыла пра слабую сувязь гаспадарак з рынкам, недаступнасць прамысловых тавараў і пашыранасць элементаў натуральнай гаспадаркі.

Вяскоўцы, як і да вайны, куплялі толькі нешматлікія тавары – запалкі, паліва, соль, святочны абутак, зрэдку асобныя элементы адзення. Амаль уся вопратка выраблялася ў вёсцы. Матэрыял для адзення давала хатняя вытворчасць ільнянога палатна. Воўна паўсюдна выкарыстоўвалася для вырабу світараў, рукавіц і валёнак. Са скуры шылі кажухі і шапкі.

Пры нязменнай сацыяльнай структуры да канца 1940-х гг. у сельскай гаспадарцы панавалі старыя метады апрацоўкі зямлі, традыцыйныя падыходы і звычаі. Шырокамаштабныя змены пачалі адбывацца ў 1950-х гг. у сувязі з міграцыяй часткі насельніцтва ў гарады, распаўсюджаннем радыёпрапаганды, школьнай асветы, калектывізацыяй, якія парушалі спрадвечныя структуры і грамадскія сувязі.

Цяглавай сілай у гаспадарцы былі, як правіла, два ці болей коней. Іх колькасць сведчыла пра заможнасць гаспадара. Каровы ў сельскай гаспадарцы не цаніліся так, як коні. Ні перад вайной, ні адразу пасля яе заканчэння жыхары вёсак не мелі зацікаўленасці ў вытворчасці малака. Малочных кааператываў амаль не існавала, таму не было ніякіх перадумоў для павелічэння колькасці і якасці буйной рагатай жывёлы. У 1939–1941 гг., калі на Беласточчыне ўсталёўвалася савецкая ўлада, многія пераканаліся, што значная колькасць кароў ці коней у гаспадарцы магла стаць падставай для абвінавачання іх уладальніка ў кулацтве, з чым звязваліся непрыемныя наступствы. У Польшчы асновы такой сістэмы ствараліся ў канцы 1940-х гг., і гэта ў значнай ступені спрычынілася да запавольнення росту ў галіне жывёлагадоўлі. Карова ў сярэднім давала 3–5 літраў малака ў дзень. Дзве ці тры каровы, якія маглі ўтрымлівацца ў 10-гектарнай гаспадарцы, давалі так мала малака, што вялікая сялянская сям'я звычайна сама спажывала яго ці непасрэдна, ці ў выглядзе масла, сыру і смятаны[4]. У невялікай колькасці гэтыя прадукты прадаваліся на гарадскіх кірмашах.

Магчымасці развіцця жывёлагадоўлі былі абмежаваны таксама недахопам паш. Дрэнная якасць лугоў, падмоклыя і зарослыя выганы, недахоп зерневых рэзерваў і паш, якія паходзілі з прапашных раслін, прадвызначылі адсутнасць прагрэсу ў гэтай галіне і ў наступныя гады. Вельмі мала вырошчвалі свіней (у сярэднім 1–3 на гаспадарку), крыху больш – авечак. Відаць, як і ў выпадку з гадоўляй кароў, магчымасці ў гэтай сферы абмяжоўваліся малай колькасцю паш, якія цяжка было зрабіць на пясчаных глебах без адпаведных укладанняў.

Ва ўсходняй частцы Беластоцкага ваяводства дамінавалі глебы IV, V і VI класаў. У справаздачы

---

[2] *Гацута У.* Рэгіянальны грамадскі музей у Белавежы // Беларускі каляндар на 1969 год. Беласток : Беларус. грамад.-культур. тав-ва, 1968. С. 177–179.

[3] *Юзвюк У.* Этнаграфічны музей у Белавежы // Беларускі каляндар на 1967 год. Беласток : Беларус. грамад.-культур. тав-ва, 1966. С. 82–83.

[4] *Юзвюк У.* Гайнаўскі павет Беластоцкага ваяводства // Беларускі каляндар на 1961 год. Беласток : Беларус. грамад.-культур. тав-ва, 1960. С. 131.

старасты Беластоцкага павета адзначалася, што ў Гарадоцкай гміне ў 1946 г. з 1 га быў атрыманы ўраджай, які тады лічыўся высокім: пшаніцы – 9 ц, жыта – 10, ячменю – 12, аўса – 8,5, бульбы – 9, буракоў – 45[5]. У іншых гмінах Беластоцкага павета ўраджаі былі яшчэ меншыя. У Бельскім павеце ў Нарвенскай і Нараўскай гмінах у пасляваенны перыяд у сярэднім збіралі 6–8 ц жыта з га[6]. Гэта не было вынікам спусташэння гаспадаркі, выкліканага вайной. Такія ўраджаі збіралі і ў міжваенны перыяд, і ў пазнейшыя гады. Без адпаведных інвестыцый гэты абшар не мог пастаўляць прадукцыю на рынак, а пры тагачаснай перанаселенасці вёсак яны былі асуджаны на натуральную гаспадарку. Адкрыццё дарогі да прамысловасці ў 1950-х гг. паклала пачатак працэсу апусцення вёсак у гэтай частцы ваяводства.

У канцы 1940-х гг. тут і далей пераважалі архаічныя метады вядзення гаспадаркі. Трохпольная сістэма пратрымалася амаль да канца 1950-х гг. Толькі ў некаторых гаспадарках няўдобіцы засейвалі лубінам, канюшынай ці сырадэляй.

Большасць прылад мелі тую самую канструкцыю і ствараліся з таго ж матэрыялу, як і стагоддзі раней. Жалезныя бароны, як і культыватары, уваходзілі ва ўжытак толькі ў пачатку 1950-х гг. Збожжа, як і раней, жалі сярпом, а малацілі цэпам[7]. Толькі наступныя дзесяцігоддзі прынеслі змены ў гэтай галіне, якія, аднак, адбываліся з вялікім супрацівам з боку сялян. Нават скошванне збожжа касой у некаторых мясцовасцях успрымалася амаль як рэвалюцыя. Здаралася, што ў канцы 1940-х гг. у адной вёсцы частка гаспадароў касіла збожжа касой, а частка, упарта трымаючыся традыцыі, – сярпом, хоць эфект і быў непараўнальны.

У выніку знішчэння большай часткі млыноў і ветракоў паўсюдна ў першыя пасляваенныя гады збожжа малолася ў жорнах. У Беластоцкім павеце са 122 млыноў ажно 80 складалі ветракі[8]. Па прычыне беднасці насельніцтва неахвотна карысталася млынамі нават там, дзе яны дзейнічалі.

У якасці транспартнага сродку паўсюдна выкарыстоўваліся вазы́ на драўляных колах з металічнай акоўкай. Грузапад'ёмнасць такога воза была малая, але нават пры невялікім цяжары ў яго трэба было запрагаць двух коней. Жахлівы стан дарог, які яшчэ больш пагаршаўся праз выкарыстанне падобных вазоў, прыводзіў да таго, што некаторыя мясцовасці практычна адразаліся ад свету ў веснавую пару разводдзя або восенню. Рэвалюцыя ў гэтай галіне адбылася толькі ў сярэдзіне 1950-х гг., калі ўвайшоў ва ўжытак воз на гумовых колах, называных у беларускіх вёсках «балёнамі». Падчас шарваркаў, або так званых грамадскіх работ, у наступным дзесяцігоддзі будаваліся дарогі. Навіной у беларускай вёсцы стаў ровар, кошт якога быў роўны кошту каровы.

Да канца 1940-х гг. у сацыяльнай структуры беларускага насельніцтва не адбылося прынцыповых змен. Перастала існаваць група землеўладальнікаў, але яны, як правіла, не былі беларусамі. Іх маёнткі ў канцы гэтага дзесяцігоддзя выконвалі ролю базы для калектыўнай сельскай гаспадаркі. У 1944 г. быў здзейснены падзел большасці маёнткаў паміж сялянамі і парабкамі, але ў 1949 г. улады запатрабавалі выплаціць запазычаныя падаткі з набытай зямлі разам з працэнтамі. Памеры гэтых выплат былі занадта высокімі для сялянскіх гаспадарак, таму нярэдка гэту зямлю аддавалі назад. У 1949 г. вытворчыя кааператывы ўзнікалі часцей за ўсё на месцы маёнткаў савецкіх калгасаў, якія дзейнічалі ў 1939–1941 гг.[9]

Значная частка зямель маёнткаў у Беластоцкім, Бельскім і Сакольскім паветах увогуле не была парцэлявана. З агульнай плошчы 8609 га буйной зямельнай уласнасці ў лістападзе 1944 г. было вылучана 2371 га[10]. Маёнткі з добрай забудовай і развітай інфраструктурай, якія знаходзіліся паблізу гарадоў, цалкам перадаваліся пад кааперацыі ці іншыя формы грамадскага выкарыстання.

Спосаб падзелу маёнткаў часта выклікаў у сялян расчараванне. Напрыклад, маёнтак у в. Дабрынева Заблудаўскай гміны плошчай 490 га быў падзелены так, што на мэты рэформы прызначалася 303 га, а рэшту пакінулі на патрэбы войска. Аднак з гэтых 303 га 254,5 га падзялілі паміж 50 сем'ямі былых парабкаў, і толькі некалькі дзясяткаў мясцовых сялян атрымалі па 1 га зямлі[11].

Рэалізаваная такім чынам рэформа не магла адыграць пераломнай ролі ў жыцці сялянскіх мас. Як правіла, мясцовыя ўлады і ўпаўнаважаныя па справах рэформы дзялілі зямлю ў першую чаргу паміж фальваркавай службай, а сяляне часта не атрымлівалі нічога[12]. Здаралася, што падзел маёнтка ў выніку прыводзіў да памяншэння зямельных плошчаў, якія апрацоўваліся сялянамі. Так было, напрыклад, у в. Кажаны Беластоцкага павета, дзе раней уладальнікі маёнтка гадамі здавалі зямлю ў арэнду мясцовым сялянам, за што атрымлівалі па 2 ц збожжа з кожнага арандаванага гектара.

[5]Arch. Państwowe w Białymstoku (далей – APB). Zespół Starostwa Powiatowego Białostockiego (далей – SPB). Sygn. 28. K. 7.
[6]*Юзвюк У.* Гайнаўскі павет… С. 148.
[7]*Барщчэўскі В.* Як за цара-бацюшкі // Ніва. 1956. 8 крас. (№ 6). С. 4.
[8]APB. SPB. Sygn. 6. K. 3.
[9]APB. Komitet Wojewódzki Polskiej Zjednoczonej Partii Robotniczej (далей – KW PZPR). Sygn. 33/IX/38. K. 170.
[10]Ibid. Sygn. l/VIII/10. K. 3.
[11]Ibid. K. 28.
[12]Ibid. Sygn. l/VIII/9. K. 112.

Падчас правядзення рэформы зямлю атрымала толькі фальваркавая служба. Такім чынам, сяляне страчвалі тыя надзелы, якія дагэтуль знаходзіліся ў іх арэндзе[13].

На канферэнцыі сакратароў ваяводскіх і павятовых камітэтаў Польскай рабочай партыі (ПРП), якая адбывалася ў Любліне 12–13 лістапада 1944 г., было пастаўлена пытанне дэлегатаў з Беластоцкага ваяводства пра тое, ці трэба ўключаць беларускае насельніцтва ў спісы для падзелу зямлі і надзяляць іх зямлёй. Адказ партыі гучаў так: «Мы павінны імкнуцца да таго, каб беларускае і ўкраінскае насельніцтва выбірала свае рэспублікі (меліся на ўвазе БССР і УССР – *Я. М.*), таму ў асноўным не трэба надзяляць зямлёй, асабліва там, дзе зямлі мала»[14].

Нягледзячы на гэтыя пастановы партыйных улад, у мясцовасцях, населеных галоўным чынам беларусамі, маёнткі таксама дзяліліся. У 1944 г. беларусы таксама станавіліся ўладальнікамі парцэляванай зямлі. У рэшце рэшт на тэрыторыі трох паветаў – Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага – былі падзелены 100 маёнткаў, з якіх стварылі 911 новых гаспадарак, уладальнікамі якіх сталі былыя парабкі. Сярэдняя велічыня новых гаспадарак складала 3,8 га[15].

Ваенныя дзеянні і хвалевыя перамяшчэнні войск былі вельмі разбуральнымі фактарамі для сельскай гаспадаркі. Ваенныя дзеянні выклікалі зніжэнне ўраджайнасці на тэрыторыі павета прыблізна на 30 %, а войскі, праходзячы, забралі або знішчылі каля 90 % запасаў корму[16].

У пачатку 1945 г. узніклі вялікія цяжкасці з забеспячэннем харчамі насельніцтва на ўсёй усходняй частцы Беластоцкага ваяводства. Адсутнасць збожжавых рэзерваў была абумоўлена і тым, што нават сяляне, якія мелі прадуктовыя запасы і жылі ў памежных гмінах, не ведаючы, грамадзянамі якой дзяржавы яны ўрэшце сталі, устрымліваліся ад продажу і здачы паставак, бо чакалі канчатковага высвятлення сітуацыі[17].

Тым часам улады спаганялі падаткі, прымушалі здаваць збожжа і мяса на патрэбы ўзмоцненай арміі і жыхароў зруйнаваных гарадоў. Неабходнымі былі тавары, дэфіцыт якіх адчуваўся і ў вёсцы. Занадта энергічны збор падаткаў прывёў да такога стану, пры якім у некаторых мясцовасцях Бельскага павета вясной 1945 г. вымалёўваліся перспектывы недахопу яравога збожжа, для таго каб засеяць загадзя вызначаныя плошчы[18].

На ўжо згаданай канферэнцыі ПРП прадстаўнік Беластоцкага ваяводскага камітэта параўнаў памер абавязковых паставак збожжа з 15-гектарнай гаспадаркі падчас акупацыі і пасля вайны. Як вынікала з яго даклада, падчас акупацыі падатак на такую гаспадарку складаў 11 ц збожжа штогод, а пасля вайны вырас да 22,1 ц[19].

У 1946 г. у сувязі з цяжкасцямі ў спагнанні матэрыяльных павіннасцей Цэнтральны камітэт ПРП даслаў у Беластоцкі ваяводскі камітэт інструкцыю наступнага зместу: «… трэба выкарыстоўваць і рэпрэсіўныя сродкі, такія як: 1) складанне гмінных чорных спісаў тых асоб, якія сабатуюць выплату падаткаў; 2) арышт кароў да часу выплаты падаткаў; 3) дадатковыя дарожныя шарваркі для тых, хто не выплаціў падаткаў. Акрамя таго, уводзіцца забарона на памол збожжа для тых, хто не выплаціў прынамсі 50 % належнай сумы. У выпадку, калі камісія грамадскага кантролю высветліць факты нелегальнага памолу, трэба прыцягваць кіраўнікоў млынаў да судовай адказнасці. <…> Трэба прасачыць, каб старасты, войты, солтысы і зборшчыкі, якія працуюць з поўнай аддачай, былі адзначаны як маральна, так і матэрыяльна ў выглядзе прэмій, выплачаных наяўнымі грашамі або таварамі»[20].

Становішча беларусаў адразу пасля вайны было асаблівым: тыя, хто заявіў пра жаданне выехаць у БССР, не плацілі падаткаў і не выконвалі павіннасцей, затое астатнія, баючыся прымусовага перасялення, стараліся паводзіць сябе лаяльна ў дачыненні да польскай дзяржавы і па меры магчымасці разлічвацца з усімі ўскладзенымі на іх абавязкамі. У выніку ў гмінах, населеных беларусамі, хоць гэта і былі абшары з найгоршай якасцю зямлі, эканамічныя павіннасці выконваліся ў значна большай ступені, чым у гмінах, населеных выключна польскім насельніцтвам. Выкананне павіннасцей значна аслабляла сялянскую гаспадарку, стрымлівала развіццё жывёлагадоўлі, рабіла немагчымай таварную вытворчасць. Атрыманне лішкаў прадукцыі на продаж для сярэдняй вясковай гаспадаркі было практычна нерэальным.

У бяднейшых гаспадарках пасля разліку з павіннасцямі часта не хапала харчоў для ўласнай сям'і. Часам, гэтак жа як і перад вайной, летам чакалі, пакуль паспее збожжа. Першыя снапы прывозілі ў гумно, абмалочвалі цэпам, зерне малолі на жорнах, каб для далейшай працы ў час жніва быў прынамсі хлеб[21].

На працягу некалькіх гадоў пасля заканчэння вайны эканамічныя павіннасці на карысць дзяржавы не толькі не памяншаліся, але і сістэматычна

[13]Ibid. K. 60.
[14]Ibid. K. 148. (Пераклад наш. – *Э. М.*)
[15]Ibid. Sygn. l/VIII/10. K. 7.
[16]APB. Starostwo Powiatowe Bielsk Podlaski (SPBP). Sygn. 18. K. 6.
[17]Ibid. Sygn. 19. K. 2–5.
[18]Ibid. K. 1.
[19]APB. KW PZPR. Sygn. l/VIII/9. K. 129.
[20]Ibid. Sygn. l/VIII/4. K. 124. (Пераклад наш. – *Э. М.*)
[21]*Нурэцкі М.* Хлеб // Ніва. 1982. 6 чэрв. (№ 14). С. 1.

ўзрасталі ў сувязі з пачаткам аднаўлення гарадоў і прамысловасці. У студзені 1948 г. падчас сходу солтысаў у адной з гмін Беластоцкага павета яны атрымалі даручэнне мабілізаваць жыхароў вёскі на выплату пратэрмінаваных падаткаў за 1947 г., збор збожжа ў рамках так званай нацыянальнай даніны (на асваенне далучаных у 1945 г. заходніх зямель), узносы на аднаўленне Варшавы і помнік у Асвенцыме[22]. На наступнай нарадзе, якая адбылася праз тыдзень, солтысам было даручана сабраць узносы на помнік удзячнасці Савецкай Арміі, авансавыя выплаты ў памеры 60 % зямельнага падатку на 1948 г. і, акрамя таго, авансавыя ўзносы ў фонд электрыфікацыі вёскі, супрацьпажарны фонд і аплату чысткі комінаў[23]. Раз ці два на месяц вёска павінна была даваць фурманку ў карыстанне гміннай управы. Пра эканамічнае становішча вёскі ў гэты перыяд сведчыць сярод іншага той факт, што праз недахоп грошай на тытунь сяляне звярнуліся да ўлад з просьбай дазволіць вырошчваць яго самім[24].

Фактарам, які дэзарганізоўваў палявыя працы, быў абавязак адпрацоўкі шарваркаў на будаўніцтве дарог, высечцы лесу, транспарце. У абавязкі сялян уваходзіла таксама пастаўка дроў для патрэб афіцыйных устаноў, школ, міліцэйскіх пастарункаў[25]. Летам 1948 г. з'явіўся яшчэ адзін абавязак – пошукі каларадскага жука. Да гэтай справы прыцягвалася насельніцтва ўсёй вёскі, якое адрывалі тым самым ад штодзённых заняткаў. Акрамя таго, сяляне павінны былі ўдзельнічаць у розных урачыстасцях, якія ладзіліся ў час палявых прац і прысвячаліся падзеям ці асобам, якія мала цікавілі вясковае насельніцтва, як, напрыклад, гадавіна з дня смерці Ф. Шапэна ці нараджэння А. Міцкевіча[26].

У 1949 г. была ўведзена больш жорсткая сістэма спагнання грашовага і натуральнага падаткаў. У выпадку калі земляроб пратэрмінаваў выкананне сваіх абавязкаў перад дзяржавай, у яго гаспадарцы з'яўлялася адмысловая «рабочая» група, якая рэквізавала ўсе каштоўныя прадметы ці свойскую жывёлу, беручы звычайна больш, чым складала сума пратэрмінаванага доўгу[27]. За нявыкананыя шарваркавыя працы ўлады таксама спаганялі іх эквівалент грашамі або сельскагаспадарчай прадукцыяй.

У многіх мясцінах эканамічную сітуацыю пагаршала далейшае існаванне цераспалосіцы. Там, дзе да 1939 г. не паспелі правесці камасацыю, існавалі гаспадаркі, якія мелі некалькі, часам больш за дзясятак, участкаў зямлі, часта аддаленых адзін ад аднаго.

Пры нязменнай эканамічнай сітуацыі ў вёсцы захоўваліся некаторыя сацыяльныя адносіны яшчэ з міжваеннага перыяду. Бяднейшыя гаспадары пасылалі дзяцей да багацейшых суседзяў пасвіць кароў, каб такім чынам зарабіць 1-2 ц збожжа[28]. Надалей захоўвалася сітуацыя, якая змушала значную частку вясковага насельніцтва да пошуку магчымасцей заробку на службе ў багацейшых суседзяў. Лішак працоўных рук у вёсцы захоўваўся практычна да канца 1960-х гг. Аднак яшчэ ў канцы 1940-х гг. з'явіліся новыя перспектывы – магчымасць заробку і працаўладкавання ў горадзе.

Пакінуць вёску спачатку наважваліся людзі, якія не мелі шанцаў атрымаць уласную гаспадарку. Першымі змянялі месца жыхарства дэмабілізаваныя салдаты. Часцей за ўсё яны знаходзілі працу ў разнастайных службах аховы парадку. Жыццёвыя перспектывы для беларусаў адкрывалі такія інстытуты, як армія, міліцыя, фабрыкі, у нязначнай ступені – адміністрацыйны апарат. Міграцыя ў гарады, выкліканая эканамічнымі прычынамі, пачалася толькі ў канцы 1940-х гг., а масавы характар набыла ў 1950-х гг. У значнай ступені яна абумовіла пачатак працэсу пераўтварэння вёскі. Памяншэнне колькасці працоўных рук змушала ў другой палове 1950-х гг. шукаць і выкарыстоўваць новыя метады гаспадарання. Пасля некалькіх гадоў фарсіраванай калектывізацыі, якая ламала ранейшыя звычаі і каштоўнасці, у канцы 1950-х гг. з'явіліся ўмовы для развіцця таварнай гаспадаркі, наладжвання эканамічнай сувязі ўсходнебеластоцкай вёскі з рынкам.

Працэс калектывізацыі, распачаты ў канцы 1940-х гг., у выпадку беларускай вёскі меў наступствы горшыя, чым у якім-небудзь іншым рэгіёне. Гэтым працэсам была ахоплена значна большая колькасць насельніцтва, чым у заходняй частцы ваяводства, населенай палякамі. Метады правядзення калектывізацыі былі блізкімі да тых, якія выкарыстоўваліся на тэрыторыі ўсёй краіны. Развіццё кааперацыі адбывалася пад адміністрацыйным прымусам з шантажом і рэпрэсіямі ў дачыненні да ўпартых апанентаў. Абмежаванні прыбытковасці, рост падатковых павіннасцей, абавязковыя пастаўкі, барацьба з кулацтвам – усё гэта руйнавала эканамічныя асновы індывідуальных гаспадарак. Калі на тэрыторыі ўсёй краіны барацьба з кулацтвам была нечым новым, то на Беласточчыне з гэтым звязваўся пэўны вопыт, вынесены з 1940–1941 гг. Ва ўсходняй частцы Бельскага і Беластоцкага паветаў, нягледзячы на непрыманне гэтай фор-

[22] APB. SPB. Sygn. 221. K. 1.
[23] Ibid. K. 5.
[24] Ibid. K. 9.
[25] Ibid. K. 37.
[26] Ibid. K. 66.
[27] Ibid. K. 125.
[28] Верас. Такі гаспадар прыносіць сорам // Ніва. 1958. 5 студз. (№ 1). С. 1.

мы гаспадарання, заснаванне кааператываў ішло практычна без супраціву з боку насельніцтва[29]. Псіхалагічны бар'ер перад калектыўнай гаспадаркай быў зламаны ў 1940–1941 гг., калі адмова ўступаць у калгас выклікала жорсткія рэпрэсіі. На тэрыторыі Беласточчыны ў гэты перыяд існавалі 19 калгасаў, у тым ліку 18 на землях, населеных беларусамі, і толькі адзін – у Ломжынскім павеце, дзе жылі палякі[30].

Частка беларускіх сялян ужо на сваім вопыце ведала характар калектыўнай гаспадаркі. Паводле ацэнак, сабраных гміннымі сакратарамі ПРП у канцы 1948 г., сярод сялян пераважала адназначна негатыўнае стаўленне да гэтай формы гаспадарання. Такія меркаванні выказвалі і тыя, хто ўжо з'яўляўся членам кааператыву, і тыя, хто не пераставаў працаваць на ўласнай гаспадарцы. Вядзенне гаспадаркі на пясчанай ці камяністай глебе патрабавала вялікіх намаганняў, вопыту і зацікаўленасці ўладальніка ў выніках сваёй працы. У выпадку ж калгасаў, дзе дамінавала бюракратычнае кіраванне, а кіраўнікі часта не мелі ніякага ўяўлення аб працы на зямлі і прымалі рашэнні, якія разыходзіліся са здаровым сэнсам, эфектыўнасць працы рэзка зніжалася, памяншаўся аб'ём ураджаю, атрыманага з 1 га, а сама праца дэмаралізавала сялян, бо яны выконвалі шмат дзеянняў, якія з гаспадарчага пункта гледжання былі абсурдныя, бескарысныя і нават стратныя[31].

Найхутчэй калектывізацыя праходзіла на тых тэрыторыях, дзе фальваркавую зямлю падзялілі паміж парабкамі. Новыя ўладальнікі не адчувалі такой эмацыянальнай сувязі з зямлёй, як тыя сяляне, якія атрымлівалі яе ў спадчыну з пакалення ў пакаленне. Больш за тое, праца на ўласнай гаспадарцы для многіх з іх была вялікім расчараваннем і часта прыносіла меншы прыбытак, чым той, які калісьці ім забяспечваў уладальнік фальварка. Сярод прычын слабасці гэтых гаспадарак можна назваць таксама падатковыя абавязкі перад дзяржавай, адсутнасць уласнай цяглавай сілы і дастатковай колькасці машын ды іншых прылад працы, а таксама вопыту, неабходнага ўладальніку для працы ў зусім іншай у параўнанні з ранейшай сістэме. Для былых парабкаў пераход да калектыўнай гаспадаркі не звязваўся са стратай бацькоўскай зямлі, а быў, хутчэй, вяртаннем да той сістэмы працы, якую яны ведалі і да якой былі прызвычаены.

Сялянскім дзецям, бацькі якіх ужо не мелі ўласных гаспадарак, было значна лягчэй адважыцца на выезд з вёскі, чым тым, хто меў магчымасць атрымаць спадчыну. Таму традыцыя і прывязанасць да зямлі перасталі быць перашкодамі, якія затрымлівалі сялянскую моладзь у вёсцы. Магчымасць знайсці працу ў горадзе, больш прывабныя ўмовы жыцця, вызваленне з-пад бацькоўскай апекі таксама сталі фактарамі, якія пачалі працэс апусцення беларускай вёскі. Сутыкненне з новай рэчаіснасцю не прынесла расчаравання. Вяртанне ў вёску было рэдкім выпадкам нават пасля 1956 г., калі адбывалася ліквідацыя калектыўных гаспадарак.

Новы лад у польскай дзяржаве не ўспрымаўся беларускімі сялянамі як трагедыя. Зусім наадварот, першы раз у гісторыі ён даваў ім шанец на сацыяльны, культурны і палітычны рост. У мінулым не было нічога, па чым варта было б тужыць.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Mironowicz E., Tokć S., Radzik R.* Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX w. Białystok : Wydaw. Uniw. w Białymstoku, 2005.

## References

1. *Mironowicz E., Tokć S., Radzik R.* Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX w. Białystok : Wydaw. Uniw. w Białymstoku, 2005 (in Pol.).

*Статья поступила в редколлегию 29.01.2018.*
*Received by editorial board 29.01.2018.*

[29]APB. KW PZPR. Sygn. l/VIII/16. K. 10.
[30]Ibid. K. 5-31.
[31]Ibid. K. 10.